Беражы сваё!

# «Забяспечце свой жыццёвы спакой»

## Гэта актуальная парада начальніка Бабруйскага аддзела Дэпартамента аховы МУС Беларусі Васіля БЕЛЬДЗІЯ



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Васіль Міхайлавіч родам з Украіны. Пайшоў па слядах бацькі, які працаваў у службе аховы. Бабруйск, радзіма яго жонкі, стаў і для Бельдзія родным горадам. У ахове Васіль Міхайлавіч прайшоў усе прыступкі кар'ернай лесвіцы: пачынаў службу вартаўніком на заводзе, быў міліцыянерам-кінолагам і матацыклістам, працаваў дзяжурным і намеснікам начальніка, а цяпер кіруе гарадскім аддзелам аховы.**

— У нас нармальны калектыў, дзе ёсць узаемапаразуменне паміж кіраўніцтвам і падначаленымі, — расказаў **Васіль БЕЛЬДЗІЙ**. — У аддзеле працуюць больш за 600 чалавек: і цывільныя, і міліцыянеры.

***— А ранейшыя пасады наклалі адбітак на ваша жыццё? Ёсць у вас, напрыклад, сабака і матацыкл?***

— У мяне былі паляўнічыя сабакі, але цяпер выявілася алергія. Нават калі па службе наведваю гадавальнік службовых сабакаў, то прымаю лекі. І матацыкла ў мяне няма: я люблю ездзіць за рулём легкавога аўтамабіля. Дарэчы, мой сын толькі што закончыў аўтатэхнікум. Я імкнуся давесці да яго, што толькі працай можна стаць добрым аўтамайстрам.

***— А як можна стаць добрым работнікам аховы?***

— Гэта вельмі шырокае панятце. У нас працуюць міліцыянеры, вартаўнікі, электраманцёры, мантажнікі і гэтак далей.

***— Але, напэўна, ёсць агульная якасць, якая аб'ядноўвае іх у службе аховы?***

— Так. Гэта ўменне кантактаваць з людзьмі, разумна гутарыць і правільна сябе паводзіць. Міліцэйскія патрулі звычайна гутараць з людзьмі, якія нешта парушылі. А мы — з патэнцыйнымі заказчыкамі нашых паслуг. У кожнага чалавека — свой характар, і трэба ўмець ладзіць.

***— Колькі аб'ектаў і кватэр у Бабруйску знаходзяцца цяпер пад вашай аховай?***

— Больш за 4300 кватэр і больш за 850 розных аб'ектаў. Мы таксама абслугоўваем больш за 1000 трывожных кнопак. Гэта даволі сур'ёзны аб'ём працы. І разам з тым, мы можам болей. Мы самі сябе ўтрымліваем, таму чым больш у нас будзе кліентаў — тым больш камфортна ў фінансавым сэнсе мы будзем сябе адчуваць.

***— Як крызіс паўплываў на вашу працу? Яго негатыўныя праявы закранулі беларусаў, якім даводзіцца эканоміць.***

— Мы ў гэтых умовах тарыфы не толькі не павялічылі, але і нават крыху зменшылі. Мы людзей разумеем і ідзём насустрач, калі ёсць праблемы. Напрыклад, часова прыпыняем дамовы на абслугоўванне.

***— А людзі, на ваш погляд, цяпер імкнуцца зэканоміць на ахове альбо, наадварот, ва ўмовах нестабільнасці захаваць усё, што набыта за жыццё?***

— Я параўнаў сёлетнюю статыстыку з лічбамі 2008 года, калі яшчэ не было сціснутых фінансавых абставінаў. Сітуацыя не памянялася. Нармальны працэс: штодня мы прымаем на ахову 3-5 кватэраў.

Хутка пачнецца дачны сезон, і вось ён якраз і паўплывае на нашу працу. Гэта для нас гарачая пара, хоць і не на палетках. Людзі, каб зэканоміць, ставяць пад ахову свае гарадскія кватэры толькі на цёплы час, калі з'язджаюць на лецішчы. Хоць, прызнайце, што месячная плата ў 17 500 рублёў — не самы вялікі фінансавы цяжар для сярэдняй беларускай сям'і.

***— Прызнаю, але самае дарагое — усталяваць сігналізацыю.***

— Але мы і тут ідзём на саступкі: даём тры месяцы растэрміноўкі. І можна ўсталяваць мінімальны набор ахоўнага абсталявання, які будзе каштаваць нядорага. Напрыклад, вы ў якой кватэры жывяце?

***— У трохпакаёвай, на трэцім паверсе, але з коткай.***

— Мінімальны набор блакіроўкі — 380 тысяч рублёў. Калі максімальны — пад мільён. І не кажыце, што ўсё роўна шкада грошай. Іх ніколі не будзе дастаткова. Трэба вызначыцца, што больш важна — спакой альбо эканомія пэўных грошай. Я раіў бы забяспечыць перш за ўсё свой жыццёвы спакой.

***— Але я — незаможны чалавек, і ў мяне, падаецца, няма чаго ахоўваць. Якая, на ваш погляд, мінімальная маёмасць, якую ўжо трэба ахоўваць?***

— Нават калі ў кватэры толькі раскладушка і сціплае адзенне. Няхай да самага беднага чалавека злодзей забраўся ў кватэру, гэта ўжо страшна. Нават маральным аспектам. Як чалавек будзе сябе адчуваць, калі даведаецца, што ў яго жыллі пабывала нейкая дрэнь? Прабачце, але я заўсёды ставіўся з пагардай менавіта да тых, хто крадзе ў людзей.

Багаты чалавек альбо бедны, усё адно ў яго ёсць сваё дабро. У бабулек кавалак сала крадуць, кансерваванні. Ці, напрыклад, ёсць пара абутку. Сярэдні кошт — 200 тысяч рублёў. Калі ў вас скрадуць толькі боты, усё роўна гэта немалы ўрон. І лепей плаціць больш за 10 месяцаў грошы ахове, каб захаваць іх.

***— А здараліся такія непрыемныя выпадкі з вамі ці вашымі знаёмымі?***

— Са мной — не. Як толькі ў маёй кватэры з'явіўся тэлефон, мы ўсталявалі сігналізацыю. І мне цяпер цяжка ўявіць, як чалавек можа зачыніць свае дзверы проста ключом і з'ехаць на два тыдні. Бяспека і, адпаведна, спакой каштуюць грошай, але навошта эканоміць на сваіх нервовых клетках?

А знаёмых абкрадалі. Прычым былі такія выпадкі, калі я пераконваў здаць кватэру пад ахову, і мне адказвалі, што, маўляў, красці няма чаго. А потым выяўлялася, што ёсць.

***— А вам асабіста даводзілася затрымліваць зладзеяў?***

— За 20 гадоў у ахове даводзілася. Аднойчы быў выпадак, калі спрацавала сігналізацыя ў кватэры на першым паверсе. У высокім зашклёным балконе адна шыба разбіта, і ціха. Я прыпадняў вадзіцеля і ён убачыў чалавека, які схаваўся ў кутку. Гэта быў раней судзімы мужчына, і як чалавек вопытны, даваў потым адпаведныя паказанні. Маўляў, спакойна стаяў на вуліцы і нікога не чапаў, а тут ідуць міліцыянеры і пытаюцца: «Судзімы?», а ён праўду адказаў, яму наручнікі надзелі і закінулі на балкон...

Увогуле ў нас тут хапае цікавых момантаў. Зусім нядаўна наш нарад ехаў уначы па гарадской вуліцы і ўбачыў двух чалавек, якія неслі нейкія баулы. Прытармазілі, а тыя кінулі рэчы і далі драпака. Злавілі іх хутка, бо якраз снегам прыпарушыла дарогу. Але не кажуць людзі, дзе скралі. Аднак ёсць жа сабакі, якія могуць чытаць сляды! Сабака, якога потым бабруйскія журналісты назвалі «Камісар Дэн», знайшоў дом. Яго гаспадары яшчэ не ведалі, што іх абакралі, а мы ўжо злавілі злачынцаў і вяртаем скрадзенае дабро.

***— Дзе можна захоўваць у жыллі грошы і каштоўнасці, каб да іх не дабраліся зладзеі? Можа, вы параіце?***

— Зладзеі вельмі хутка вылічваюць усе такія месцы. Людзі, як правіла, хаваюць у адных і тых жа месцах.

***— У бялізне, пад матрацам, у крупах, у посудзе...***

— Я памятаю, як у аднаго артыста скралі грошы. Яны былі ўкладзеныя ў курыную тушку, якая захоўвалася ў маразільніку. І ўсё роўна знайшлі і скралі. Зладзеі ўсе месцы вылічваюць імгненна. Так што я парады тут даць не магу.

***— Ці былі сярод зладзеяў такія персанажы, якія вас моцна здзівілі?***

— Так. У прыватным доме каля апоўначы спрацавала сігналізацыя. Нарад выяўляе пранікненне і затрымлівае маладую пару зладзеяў. Але калі сталі аглядаць тэрыторыю вакол дома, то заўважылі дзіцячую каляску: там, у цемры, пасярод ночы, дзіця спакойна смактала малако з бутэлькі. Пакуль бацькі кралі...

***— У злачынцаў таксама ёсць дзеці.***

— Можна было б хоць неяк зразумець, калі б частка сродкаў пайшла на дзіця. Але звычайна ўсё ідзе на прапой, як ні шкада.

***— А даводзілася супрацоўнікам аховы ўжываць зброю?***

— Зброя — патрэбны элемент баявой экіпіроўкі, але ў Бабруйску яе ў ахове ніколі не ўжывалі. Хоць такі выпадак быў у сталіцы.

У сярэднім мы маем за суткі 30-40 выездаў. Але ў абсалютнай большасці спрацоўвае сігналізацыя з розных прычын, але не пры пранікненні зладзеяў.

***— Я нядаўна даведалася пра выпадак, калі ў Крыме байцы нейкага спецпадраздзялення ўварваліся ў кватэру, нават пакалечылі гаспадара, а потым здагадаліся спытаць прозвішча і папрасілі прабачэння: маўляў, пераблыталі адрас, не таго чалавека затрымлівалі...***

— Нейкае варварства. Нашы так не робяць. Могуць, безумоўна, да сценкі прыціснуць і ўдакладніць асобу. Але мы імкнёмся працаваць карэктна.

Хоць кур'ёзныя сітуацыі, вядома ж, здараліся. Аднойчы, калі я працаваў у групе затрымання, у адной кватэры двойчы спрацавала сігналізацыя. Я падбег да дзвярэй, а яны адчыненыя і ў вітальні ўпакаваныя кайстры стаяць. Гэта значыць: сур'ёзная сітуацыя. Адрэналін у крыві, зброя ў руцэ.

Чую гукі вады з ваннай. Выходзіць жанчына, амаль у адным ручніку. Яна на мяне глядзіць моўчкі, я — на яе. Уявіце яе стан: яна выходзіць з ванны, а тут у яе чалавек цэліцца з пісталета. Нямая сцэна.

Аказалася, што яна прыехала з лецішча з кайстрамі. Спяшалася на вяселле, таму забылася пра сігналізацыю, і стала тэрмінова прыбірацца. Калі я паглядзеў яе дакументы і пераканаўся, што яна — гаспадыня, усё ўладзілася.

***— На ваш погляд, ці варта мець у доме ці кватэры трывожную кнопку?***

— Усё залежыць ад таго, як чалавек адчувае сябе ў грамадстве. Добра, калі ёсць упэўненасць, што дома вы ў поўнай бяспецы. Але ёсць людзі, якія займаюць пэўнае становішча, альбо маюць каштоўнасці і зберажэнні. Тады такая кнопка сапраўды пазбавіць ад хваляванняў. І трывожная кнопка — гэта сёння не механізм у сцяне, а бірулька з кнопкай, якая дзейнічае ў радыусе 1,5 кіламетра.

***— Якая, на ваш погляд, будучыня ў аховы?***

— Ахова ў тым ці іншым выглядзе існавала заўсёды. Нават калі чалавек грукаў бразготкай «У Багдадзе ўсё спакойна!» — гэта таксама від аховы, клопат пра бяспеку грамадзян.

Цяпер можна атрымліваць СМСкі пра пранікненне ў кватэру, а мы хутка зможам ахоўваць аўтамабілі, дзе б яны ні знаходзіліся. У Дэпартаменце аховы ёсць добрыя тэхнічныя навіны.

У якім выглядзе заўтра будзе ахова і да чаго дойдзе тэхнічны прагрэс — сказаць цяжка. Але наўрад ці чалавек у найбліжэйшай будучыні не будзе думаць пра тое, як абараніць сваю маёмасць.

Дарэчы, ва Украіне служба аховы не вельмі развіта. Там гэтым займаюцца прыватныя структуры. Крадзяжы ёсць, але мае ўкраінскія сваякі нават не вядуць размову пра ўсталяванне сігналізацыі. Можа таму, што каштуюць падобныя паслугі больш, чым у нас? Ва ўсякім разе, беларусы — людзі прасунутыя ў пытаннях аховы і бяспекі.

**Гутарыла Ілона ІВАНОВА.**
*г. Бабруйск.*

## КОШТ ТЭХАГЛЯДУ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ НА 10 %

**Пастановай Міністэрства эканомікі ад 25 сакавіка № 50 зацверджаны прэйскурант на паслугі па правядзенні дзяржаўнага тэхнічнага агляду транспартных сродкаў з павышэннем дзейнага ўзроўню тарыфаў у сярэднім на 10 %, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе міністэрства.**

Як патлумачылі ў Мінэканомікі, гэтае рашэнне прынятае з мэтай недапушчэння стратнасці паслуг па правядзенні дзяржаўнага тэхнічнага агляду транспартных сродкаў.

## ТАКСІ: УЗРОСТ НЕ ПЕРАШКОДА

**З 1 красавіка гэтага года знятыя ўзроставыя абмежаванні па рэгістрацыі аўтамабіляў-таксі і транспартных сродкаў катэгорыі М2, якія прызначаныя для перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах, паведамілі «Звяздзе» ва УДАІ УУС Мінаблвыканкама.**

Як удакладнілі ў Дзяржаўтаіспекцыі, раней у якасці аўтамабілятаксі ўпершыню мог быць зарэгістраваны аўтамабіль, не старэйшы за 10 гадоў.

Акрамя таго, паведамілі ва УДАІ, з мэтай кантролю за ўдзелам у дарожным руху транспартных сродкаў з таніраваным шклом з 1 красавіка пры рэгістрацыі аўтамабіля з заводскай таніроўкай шкла, што ўвезеныя ў Беларусь і зарэгістраваныя да 1 красавіка 2006 года, у абавязковым парадку ў графе «асаблівыя адзнакі» пасведчання аб рэгістрацыі неабходна пазначаць дату мытнага афармлення. Калі будуць адсутнічаць, то як пры праходжанні тэхагляду, так і ў ходзе нагляду за дарожным рухам гэта будзе расцэньвацца як парушэнне пункта 194.12 Правілаў дарожнага руху.

Дзяржаўтаінспекцыя таксама інфармуе пра тое, што з 1 мая гэтага года пры выдачы пасведчання аб рэгістрацыі транспартных сродкаў графа «марка-мадэль» будзе запаўняцца на англійскай мове, як гэта прадугледжана Канвенцыяй аб дарожным руху, прынятай у Вене ў 1968 годзе.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## Наркакур'ер затрыманы

Крымінальная справа ўзбуджана ў дачыненні да 32-гадовага жыхара Гомеля, які займаўся пастаўкамі ў абласны цэнтр і рэалізацыяй буйных партый метамфетаміна. З прыбалтыйскай краіны мужчына арганізаваў канал пастаўкі гэтага наркотыка і збываў яго па 50-100 грамаў дылерам для продажу на дыскатэках Гомеля. Зараз даказаны яго ўдзел у пастаўках 58 і 75 грамаў метамфетаміна, якія раней быў канфіскаваны супрацоўнікамі аддзялення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі АУС адміністрацыі Савецкага раёна г. Гомеля. Для захавання метамфетаміна ў лясным масіве ў Жлобінскім раёне наркакур'ер абсталяваў тайнік, дзе было знойдзена 158 грамаў наркотыку. Гэтая колькасць разлічана на прыгатаванне 600 разавых доз, кошт якіх складае каля 7 тысяч долараў ЗША.

## Не да жарцікаў

Выклік аб мініраванні вялізнай крамы будаўнічых матэрыялаў на ўскраіне Гомеля паступіў на спецлінію «102» днём 31 сакавіка. Супрацоўнікі МНС сумесна з міліцыяй хутка эвакуявалі з памяшкання больш за 100 чалавек — пакупнікоў і абслуговага персаналу. Пасля таго, як будынак быў правераны на наяўнасць выбуховых прыладаў, стала зразумела, што выклік быў фальшывым. Тым часам міліцыя вылічыла «мінёра», і зараз у гэтым абвінавачваюць 33-гадовага гамяльчаніна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

В публикации извещения о проведении аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков (газета «Звязда», № 55 от 25.03.2009 г., 7-я полоса) дату проведения аукциона следует читать — **29.04.2009** года.

Трастбанк

# ЗАО «Трастбанк»

*г. Минск, ул. Игнатенко, 11*

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2009 г.

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2008 г. | 2007 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | **14 518,1** | **2 751,6** |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 | **51 439,6** | **4 213,7** |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | | **8 197,3** | **7 497,4** |
| | для торговли | 11031 | 3 | — | — |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 3.1 | — | — |
| | в наличии для продажи | 11033 | 3.2 | **8 197,3** | **7 497,4** |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4 | **102 383,9** | **18 787,4** |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | **151 794,1** | **53 075,6** |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 6 | **98,0** | **98,0** |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 7 | **33 307,4** | **24 277,4** |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 | **5 545,9** | **4 759,0** |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | | **367 284,3** | **115 460,1** |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 9 | — | — |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 10 | **4 406,3** | **32 505,2** |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 11 | **285 350,4** | **38 270,4** |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | **15 480,9** | — |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 12 | **8 414,5** | **4 572,1** |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | | **313 652,1** | **75 347,7** |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 13 | **22 944,7** | **14 501,0** |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | — | — |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | **3 441,7** | **2 754,2** |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 14 | **2 139,7** | **2 876,2** |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 15 | **25 106,1** | **19 981,0** |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | | **53 632,2** | **40 112,4** |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | **367 284,3** | **115 460,1** |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 16 | **83 931,6** | **70 002,9** |
| 28 | Обязательства | 1302 | 17 | **35 317,9** | **38 216,5** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2008 г.

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2008 г. | 2007 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 22 871,8 | 13 141,3 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 13 308,5 | 8 930,3 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 18 | 9 563,3 | 4 211,0 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 17 424,1 | 9 197,6 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 1 922,7 | 709,9 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 | 15 501,4 | 8 487,7 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20 | 2 883,2 | 1 194,9 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 21 | (-0,5) | (-0,4) |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | — | 6,6 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 22 | 3 990,9 | 1 672,7 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 23 | 1 700,1 | 2 468,7 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24 | 15 928,3 | 12 577,0 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 25 | 2 221,2 | 999,2 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 1 677,9 | 384,5 |
| **15** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ОТЧЕТНОГО ГОДА** | **2** | | **5 829,2** | **735,1** |
| 16 | Базовая прибыль на простую акцию | | | 4,50 | 0,60 |
| 17 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | — | — |

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2008 г.

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статей капитала / Наименование показателей | Символ | Уставный фонд | Эмиссионный доход | Резервный фонд | Накопленная прибыль (убыток) | Фонд переоценки статей баланса | Всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 2 | Остаток на 1 января 2007 г. | 3011 | 14501,0 | — | 2353,4 | 2541,9 | 17940,4 | 37336,7 |
| 3 | Изменения статей капитала | 3012 | — | — | 400,8 | 334,3 | 2040,6 | 2775,7 |
| | В том числе: | | | | | | | |
| 3.1 | прибыль (убыток со знаком «минус») | 30121 | х | х | х | 735,1 | х | 735,1 |
| 3.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | — | х | 400,8 | (-400,8) | х | — |
| 3.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | — | — | х | — | х | — |
| 3.3.1 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | — | — | х | х | х | — |
| 3.3.2 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | х | х | х | — | х | — |
| 3.3.3 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | — | х | х | х | х | — |
| 3.4 | проведение переоценки статей баланса | 30124 | х | х | х | х | 2040,6 | 2040,6 |
| 3.5 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | — | — | — | — | — | — |
| 3.6 | прочие изменения | 30126 | — | — | — | — | — | — |
| 4 | Остаток на 1 января 2008 г. | 3013 | 14501,0 | — | 2754,2 | 2876,2 | 19981,0 | 40112,4 |
| **5** | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 6 | Остаток на 1 января 2008 г. | 3011 | 14501,0 | — | 2754,2 | 2876,2 | 19981,0 | 40112,4 |
| 7 | Изменения статей капитала | 3012 | 8443,7 | — | 687,5 | (-736,5) | 5125,1 | 13519,8 |
| | В том числе: | | | | | | | |
| 7.1 | прибыль (убыток со знаком «минус») | 30121 | х | х | — | 5829,2 | х | 5829,2 |
| 7.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | 5578,3 | х | 987,5 | (-6565,8) | х | — |
| 7.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 2565,4 | — | х | — | х | 2565,4 |
| 7.3.1 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 2565,4 | — | х | х | х | 2565,4 |
| 7.3.2 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | х | х | х | — | х | — |
| 7.3.3 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | — | х | х | х | х | — |
| 7.4 | проведение переоценки статей баланса | 30124 | х | х | х | х | 5125,1 | 5125,1 |
| 7.5 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | 300,0 | — | (-300) | — | — | — |
| 7.6 | прочие изменения (округление) | 30126 | — | — | — | 0,1 | — | 0,1 |
| 8 | Остаток на 1 января 2009 г. | 3013 | 22944,7 | — | 3441,7 | 2139,7 | 25106,1 | 53632,2 |

## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2008 г.

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2008 г. | 2007 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 7010 | | **22 872,7** | **13 141,3** |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 7011 | | **-13 081,9** | **-9 000,6** |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 7012 | | **17 424,1** | **9 197,3** |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 7013 | | **-1 818,7** | **-745,1** |
| 6 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 7014 | | **2 883,2** | **1 194,9** |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 7015 | | **-0,5** | **-0,4** |
| 8 | Доход в форме дивидендов | 7016 | | — | **6,6** |
| 9 | Прочие полученные доходы | 7017 | | **1 634,2** | **867,8** |
| 10 | Прочие уплаченные расходы | 7018 | | **-17 202,1** | **-11 471,1** |
| 11 | Уплаченный налог на прибыль | 7019 | | **-1 725,4** | **-320,3** |
| 12 | Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и обязательствах | 701 | | **10 985,6** | **2 870,4** |
| 13 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 7020 | | **-7 805,1** | **3 470,9** |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 7021 | | **-482,6** | **-906,0** |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов и других денежных средств в банках | 7022 | | **-72 183,1** | **3 614,9** |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 7023 | | **-100 095,7** | **18 081,9** |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 7025 | | **486,0** | **17 420,4** |
| 18 | Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов | 702 | | **-180 080,5** | **41 682,1** |
| 19 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 7030 | | — | — |
| 20 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в форме кредитов и других средств банков | 7032 | | **-26 644,2** | **-3 950,6** |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 7033 | | **245 913,9** | **-23 105,2** |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 7034 | | **15 400,0** | — |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 7035 | | **-1 087,0** | **-20 895,1** |
| 24 | Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств | 703 | | **233 582,7** | **-47 950,9** |
| 25 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | **64 487,8** | **-3 398,4** |
| 26 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:** | | | | |
| 27 | Приобретение основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов | 7110 | | **-4 713,6** | **-2 201,4** |
| 28 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 7111 | | **9,1** | **1 564,0** |
| 29 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 7112 | | — | **-38,6** |
| 30 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 7113 | | **7,8** | — |
| 31 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 7114 | | — | — |
| 32 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 7115 | | — | — |
| 33 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | **-4 696,7** | **-676,0** |
| 34 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:** | | | | |
| 35 | Эмиссия акций | 7211 | | 1 077,1 | — |
| 36 | Выкуп собственных акций | 7212 | | — | — |
| 37 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 7213 | | — | — |
| 38 | Выплата дивидендов | 7214 | | — | — |
| 39 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | **1 077,1** | — |
| 40 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | **369,9** | **207,4** |
| 41 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | **61 238,1** | **-3 867,0** |
| 42 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | 1 | **7 496,1** | **11 363,1** |
| 43 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 1 | **68 734,2** | **7 496,1** |

**Председатель Правления ЗАО «Трастбанк» — А.Д. Осмоловский**

**Главный бухгалтер — Н.В. Бродик**
**«25» марта 2009 г.**

**Достоверность бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств подтверждается во всех существенных аспектах.**

**Директор АООО «Аудитэл» — А.И. Папковский**
**«26» марта 2009 г.**

### Аудиторское общество с ограниченной ответственностью «Аудитэл»

*220012, г. Минск,*
*пер. Калининградский, 16,*
*тел./факс 280 35 39;*
*e-mail: auditel@mail.ru*

Аудитэл

*р/с 3012007218011*
*в «Приорбанк» ОАО*
*ЦБУ 100 г. Минск, код 749*
*УНП 100591487*

Исх. 40
26 марта 2009 г.

**Председателю Правления**
**ЗАО «Трастбанк»**
**А.Д. Осмоловскому**

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ
## по годовому отчету за 2008 год

**Аудируемое лицо:**
Закрытое акционерное общество «Трастбанк»;
сокращенное наименование: ЗАО «Трастбанк»;
место нахождения банка: Республика Беларусь, г. Минск, ул. В.И. Игнатенко, 11;
сведения о государственной регистрации: банк зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 09 ноября 1994 г., регистрационный номер № 53;
УНП 100789114.

**Аудиторская организация:**
Аудиторское общество с ограниченной ответственностью «Аудитэл»;
место нахождения — 220012, г. Минск, Калининградский пер., 16;
свидетельство о государственной регистрации в качестве аудиторской организации № 100591487 от 28 сентября 2000 г., выданное Минским городским исполнительным комитетом;
УНП — 100591487
специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности 02200/0061001 от 03 февраля 2004 г., выданное Министерством финансов Республики Беларусь на срок по 02 февраля 2009 г.; лицензия продлена до 02 февраля 2014 г. за номером 02200/0495343 от 02 февраля 2009 г.;
лицензия на осуществление аудиторской деятельности в банковской системе № 2 от 17 ноября 2004 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь на срок 5 лет со дня выдачи.

Мы проведи аудит прилагаемого годового отчета ЗАО «Трастбанк», состоящего из бухгалтерского баланса на 01.01.2009, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств за 2008 г., примечаний, включая краткое описание существенных элементов учетной политики и прочие пояснения.

Руководство ЗАО «Трастбанк» несет ответственность за подготовку и представление годового отчета в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверного годового отчета, не содержащего существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данного годового отчета и соответствии совершенных ЗАО «Трастбанк» финансовых (хозяйственных) операций законодательству, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями республиканских правил аудиторской деятельности. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия или отсутствия существенных искажений в представленном годовом отчете.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытия информации в годовом отчете. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения годового отчета в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения годового отчета нами рассматривалась система внутреннего контроля ЗАО «Трастбанк» с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а также с целью выражения мнения относительно организации этой системы.

Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления годового отчета.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

По нашему мнению, годовой отчет ЗАО «Трастбанк», сформированный в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ЗАО «Трастбанк» на 1 января 2009 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2008 г. При этом совершенные ЗАО «Трастбанк» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству. Действующая в ЗАО «Трастбанк» система внутреннего контроля соответствует характеру, масштабам и условиям деятельности банка. Нормативы безопасного функционирования, установленные Национальным банком Республики Беларусь, по состоянию на 1 января 2009 г. выполнены.

Не изменяя мнения о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности, мы обращаем внимание, что Банк в течение года на отдельные даты превышал норматив максимального размера кредитного риска на одного должника по средствам, размещенным в других банках.

**Директор АООО «Аудитэл» — А.И. Папковский**

**Аудитор, возглавлявший аудит — С.А. Волкова**

**Дата подписания: 26 марта 2009 г.**

*Лицензия № 14 от 13.11.2008 г., выдана Нацбанком РБ. УНП 100789114.*

